# На тым тыдні...

✓ **22 студзеня** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея «Дом-музей I з'езда РСДРП» пачала працаваць **аўтарская выстаўка фатаграфіі «13-е Акно»**.

Тут прадстаўленыя дванаццаць працаў фатографа А. Лінэмана, які працуе ў розных жанрах, у тым ліку вулічнай фатаграфіі. Аўтар выкарыстоўвае толькі аналагавыя фотаапараты і часцей за ўсё чорна-белую плёнку. У экспазіцыі змешчаныя здымкі, зробленыя ў 2016 – 2017 гг. пад час наведвання культурнага цэнтра Галіцыі – Львова. У працах адлюстраваныя стылістычныя асаблівасці гарадской архітэктуры, спалучэнне актуальных элементаў дэкору і класічных формаў, а таксама перададзеная атмасфера сучаснага турыстычнага горада, які здолеў захаваць дух шматвекавой гісторыі і традыцыі розных культураў сваіх насельнікаў.

✓ **23 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшло **мерапрыемства, прысвечанае завяршэнню дабрачыннай акцыі «Кніга – крыніца мудрасці, ведаў і навукі...»**.

У рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання Нацыянальная бібліятэка Беларусі абвясціла дабрачынную акцыю «Кніга – крыніца мудрасці, ведаў і навукі...», што праходзіла цягам юбілейнага 2017 года. Збіраючы кнігі для перадачы ў сацыяльныя ўстановы і бібліятэкі краіны, Нацыянальная бібліятэка Беларусі стала сувязным звяном паміж тым, хто можа і хоча дапамагчы, і тымі, каму неабходная дапамога.

У рамках праекта 14 500 асобнікаў кніг было перададзена бібліятэкам дзіцячых дамоў, школаў-інтэрнатаў, дамоў ветэранаў і інвалідаў і інш.

✓ **25 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **імпрэза «Інфармацыйныя скарбы зямлі беларускай. Віцебшчына»**.

Гэта першае з вялікага цыкла мерапрыемстваў, што пазнаёмяць з інфармацыйнай спадчынай розных мясцінаў Беларусі, іх гісторыяй і культурнымі здабыткамі. Гэта своеасаблівы вынік плённай працы айчынных бібліятэк, архіваў, музеяў, навуковых і адукацыйных установаў, краязнаўцаў-аматараў па вывучэнні, узнаўленні і папулярызацыі інфармацыйных скарбаў нашай краіны.

Пад час імпрэзы выступалі вядомыя краязнаўцы-даследчыкі, прадстаўнікі бібліятэчнага і музейнага асяроддзя, гісторыкі і архівісты, а таксама прагучалі музычныя кампазіцыі, прысвечаныя роднаму краю. Імпрэзу дапоўніла тэматычная выстаўка-агляд інфармацыйных рэсурсаў пра Віцебскі рэгіён з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

✓ **25 студзеня** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» пачала працаваць **выстаўка керамікі «Між рукамі і полымем»**. На ёй прадстаўленыя працы больш чым 20 керамістаў, сталых майстроў і пачаткоўцаў. У межах выстаўкі ладзяцца сустрэчы з керамістамі, майстар-класы па ганчарстве, лепцы з гліны і роспісе керамічных вырабаў.

Выстаўка будзе працаваць па 8 лютага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ